# Бялыніцкая ДАЎНІНА

Краязнаўчы альманах
(дадатак да газеты «Паходня»)

№ 2 (16)
Снежань
2007

# Бялыніцкая зямля ў сярэднія вякі

На мяжы 13 – 14 стагоддзяў Бялыніцкая зямля поруч з іншымі беларускімі тэрыторыямі ўвайшла ў склад магутнейшай дзяржавы – Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойскага.

У 15 стагоддзі цэнтральная і ўсходняя часткі сучаснай тэрыторыі раёна адносіліся да воласці, цэнтрам якой быў замак Цяцерын. Тэрыторыя воласці прасціралася на поўдзень паабапал Друці праз увесь цяперашні Бялыніцкі раён.

Цяцерынская воласць належыла князю Сямёну – Лугвену Альгердавічу, галоўнай вотчынай якога было Мсціслаўскае княства.

Паблізу Мсціслава князь заснаваў праваслаўны Анупрыеўскі манастыр, - якому і ахвяраваў "даніну мядовую цяцерынскую". Гэтае прынашэнне ўзгадваецца і ў больш познім дакуменце, які датуецца 1468 годам, калі ўнук Сямёна князь Іван Юр'евіч Мсціслаўскі пацвердзіў манастыру папярэднія прывілеі бацькі і дзеда. У гэтым дакуменце прыгадваецца шэраг сялянскіх павіннасцяў у сяле Галоўчын на карысць Анупрыеўскага манастыра.

Пасля смерці Сямёна ў 1431 годзе яго валоданні перайшлі да сына Юрыя. Аднак ён страчвае іх праз год, калі выступіў супраць вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча.

Праз пяць год Юрый замірыўся з новым вялікім князем Казімірам і атрымаў свае вотчыны назад.

У далейшым Галоўчын разам з Цяцерынскай воласцю з'яўляўся ўласнасцю князя Івана Мсціслаўскага.

У 1501 годзе Аляксандр Казіміравіч падараваў Галоўчын сваёй жонцы Алене, якая была дачкой маскоўскага князя Івана Трэццяга. Праз восем гадоў Алена дорыць Галоўчын разам з усходняй часткай бялыніцкай зямлі маскоўскаму паводле паходжання князю Мацвею Мікіцінічу.

Пасля раптоўнай смерці Алены (1513) воласць адышла да вялікага князя Жыгімонта 1.

Да сярэдзіны 16 стагоддзя Галоўчын і раздробленая на часткі Цяцерынская воласць уваходзіла ў склад Віленскага ваяводства.

У выніку адміністрацыйна – тэрытарыяльнай рэформы 1565 года бялыніцкія землі ўваходзяць у склад трох валасцей Аршанскага павета Віцебскага ваяводства. Асноўная частка падпарадкоўвалася Цяцерынскаму валасному ўпраўленню, паўночна – заходняя ад Эсьмонаў да Клеўкі, паабапал ракі Клява – Барысаўскаму, ад Карытніцы да Замачулля – Любашанскаму. І зусім невялікая частка земля ад Пільшычаў і далей на поўдзень увайшла ў склад Быхаўскага графства.

Бялынічы і Галоўчын з'яўляліся мястэчкамі. У іх меліся замкі, яны з'яўляліся цэнтрамі маёнткаў.

У 1557 годзе ў сувязі з размежаваннем паміж Цяцерынскім маёнткам князя Збаражскага і маёнткам Галоўчын, што належыў князю Шчаснаму Яраслававічу Галоўчынскаму, вылучаецца Галоўчынская воласць, складнікамі якой сталі землі абапал ракі Вабіч з вёскамі Кудзін, Свяцілавічы.

У 16 стагоддзі на мапе нашых земляў з'яўляюцца такія паселішчы, як Алешкавічы, Ількавічы, Ігліца, Дабрылавічы і іншыя.

Мястэчкі Галоўчын і Бялынічы, як і гарады, станавіліся цэнтрамі рамяства і гандлю. Звычайна, 20 – 30 % жыхароў іх былі рамеснікамі, налічвалася па 15 – 20 прафесій.

Аднак асноўным заняткам насельніцтва заставалася сельская гаспадарка.

З канца 14 стагоддзя буйных земляўласнікаў сталі называць панамі, а самых буйных – магнатамі.

Феадалы мелі права на суд над залежным ад іх насельніцтвам. За карыстанне зямлёй сяляне павінны былі выконваць павіннасці. Паводле сваіх абавязкаў яны падзяляліся на цяглых і дваровых.

Цяглыя спачатку выплочвалі аброк, а ў пачатку 15 ст. былі пераведзены на чынш.

Дваровыя сяляне адбывалі паншчыну.

У 1557 годзе з'яўляецца дакумент за подпісам Жыгімонта Аўгуста "Устава на валокі".

У адпаведнасці з патрабаваннямі яго, была праведзена разбіўка зямлі на валокі – 21,36 гектара. Звычайна валока адводзілася ў 30 моргаў, па 10 у кожным полі. Пры гэтым уладальнікі зямлі адбіралі лепшыя ўчасткі ў сялян пад свае гаспадаркі – фальваркі.

***Анатоль Марозаў***

www.mahilou.org – сайт "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны.

# Калі на тэрыторыі Бялыніцкага раёна ўзнікла першае пасяленне?

Археалагічныя даследванні сведчаць, што першае пасяленне чалавека на тэрыторыі раёна ўзнікла яшчэ ў эпоху мезаліта (сярэднекаменны век, 9 -5 тысячагоддзе да нашай эры). Аднак выразных астаткаў пасяленняў і побытавых прадметаў чалавека мезалітнай эпохі ў раёне пакуль не знойдзена.

Важным перыядам старажытнай гісторыі з'яўляецца неаліт (апошняя стадыя каменнага веку, 5 – 2 тысячагоддзе да нашай эры). Якраз у гэты час пачаўся пераход першабытнага чалавека да вядзення жывёлагадоўлі і земляробства, вынайдзены гліняны посуд.

Сярод найбольш вядомых неалітычных паселішчаў раёна на сёння грунтоўна вывучаны стаянкі ля вёсак Лубяны, Чырвоная Слабада, Прыбар, Цяхцін, Вугольшчына. Паселішчы чалавека эпохі неаліту знойдзены таксама ў 4 кіламетрах на паўночны захад ад Бялынічаў, каля станцыі Друць, вёсак Гута, Монеўка. Пры раскопках гэтых археалагічных помнікаў звычайна знаходзяць крамневыя вырабы: наканечнікі стрэл, нажы, дзюбападобныя рэзакі, разцы, скрабкі, скоблы, сякеры, фрагменты керамікі. Жыллё мела ў плане авальную ці круглую форму, было заглыбленым у зямлю. Для абагрэву і прыгатавання ежы ўнутры размяшчаліся адкрытыя, абкладзеныя каменем ачагі. Людзі жылі абшчынамі, кожная з іх аб'ядноўвала да 100 і болей чалавекаў. Некалькі абшчын, якія размаўлялі на адной мове і валодалі канкрэтнай тэрыторыяй, складалі племя.

# Калі з'явіліся курганы, што яны сабой уяўляюць і колькі іх?

Курганы ўяўляюць сабой зямельныя насыпы, круглыя, як правіла, у плане. Яны сустракаюцца па аднаму або групамі. У народзе іх звычайна называюць капцамі, малатоўкамі, нярэдка лічаць татарскімі, шведскімі ці французскімі магіламі. На самой жа справе курганы з'яўляюцца старажытнымі пахаваннямі. Самыя раннія курганы, якіх захавалася вельмі мала, археолагі датуюць бронзавым векам.У другой палове 1 тысячагоддзя і напачатку 2 тысячагоддзя нашай эры пад кургановымі насыпамі хавала нябожчыкаў усё славяна – балцкае насельніцтва Беларусі. Калі паміраў чалавек, яго разам з абрадавым інвентаром спальвалі на вогнішчы. У памежныя 4 -10 стагоддзі абрад трупаспалення змяніўся трупапалажэннем. На месцы пахавання насыпаўся курган, у які клалі таксама зброю, прылады працы, упрыгожванні, посуд з ежай. Тут жа ладзілася і "трызна".

З умацаваннем пазіцый хрысціянскай веры традыцыі насыпання курганаў над нябожчыкамі паступова знікае – спачатку сярод гарадскога насельніцтва (11 стагоддзе), а ў 13 -14 стагоддзях і ў сельскай мясцовасці.

На тэрыторыі раёна выеўлена каля 60 курганных груп (на Беларусі – больш за 6 тысяч). Лепей захаваліся яны ў лясах па правым беразе Друці і яе прытоках – Кляве, Ліпаўцы, Малышы, Асліку. Некаторыя групы налічваюць па некалькі дзесяткаў курганаў. Каля вёсак Пільшычы – 76 насыпаў, Падзевічы – 75, Эсьмонаў – 44, Малатовак – 34, Дзевашычаў – 31, Парахоўкі – 27. Захаваліся курганы каля вёсак В. Машчаніца, Барсукі, Гута, Дручаны, Замачулле, Забалоцце, Заполле, Ігліца, Кіраўка, Курганне, Клява, Карытніца, Краснае, Лебядзянка, Монеўка, Асман – Касаева, Паліўнікі, Прыбар, Пральня, Старына, Стараселле, Цяхцін, Вугольшчына, пасёлак Ленінскі.

Вывучыўшы знаходкі, атрыманыя археолагамі пры раскопках бялыніцкіх курганаў, гісторыкі прыйшлі да высновы, што тэрыторыю раёна ў старажытныя часы засялялі дрыгавічы.

* * *

Стары калодзеж,
Ты сваёй вадзіцы
За доўгі век свой
Многім даў напіцца,
Але прыйшла пара
Зусім другая,
І вёска, дзе стаіш ты,
Адмірае.
І хто адкажа,
Год ці дваццаць пяць
Табе, калодзеж,
Смагу наталяць.

***Міхась Радоўскі***

www.nastaunik.info/ - беларускі інфармацыйна - метадычны партал для настаўнікаў Беларусі

## Гісторыя нашых вёсак

# Дручаны

Вёска Дручаны мае даўнюю гісторыю, якая, на жаль, яшчэ ахутаная суцэльнай смугой невядомасці. Можна меркаваць, што першымі насельнікамі паселішча яго заснавальнікамі з'явіліся ўцекачы з Друцкага княства. Прычын тых пярэбараў можа быць многа, але найбольш верагодныя з іх дзве. Напрыканцы 12 стагоддзя Друцкае княства ўцягваецца ў барацьбу князёў смаленскіх з чарнігаўскімі. Князь Ігар Святаслававіч памкнуўся захапіць валоданні Друцкіх князёў. Многія паселішчы ім былі спалены і зруйнаваны, а іх жыхароў палонам павёў у Кіеўскую зямлю. Праўда, Друцк ён захапіць так і не здолеў. Мажліва. Што ўцекшыя ад палону сяляне і заснавалі ў дрымучых, забалочаных лясах нашага краю сваю вёску і ў памяць аб сваёй адабранай радзіме назвалі яе Дручаны (насельнікі Друцкага княства).

Паводле другой версіі, пачатак заснавання вёскі адносіцца на канец 15 – пачатак 16 стагоддзяў, калі Друцк пры варожай асадзе загінуў ад пажару і болей не аднавіўся.

На жаль, болей звестак па гісторыі вёскі ў старажытную эпоху не маецца.

Вядома, што ў 1922 годзе тут у звычайнай вясковай хаце была адкрыта школа. Праз 8 гадоў непадалёку ад сажалкі быў узведзены новы школьны будынак. Настаўнічала ў школе Ніна Іванаўна Трызна. У гады камуністычнага генацыду яна падверглася рэпрэсіям.

Дзесяць гадоў (1920 – 1930) Дручаны з'яўляліся цэнтрам сельсавета, які ўзначальваў Максім Бародзіч. Падчас калектывізацыі ў Дручанах узнікла калектыўная арцель – калгас "Чырвоны гаспадар".

У гады Вялікай Айчыннай вайны немцы спалілі школу. Лес, што блізка падступаў да вёскі, па іхняму загаду быў выразаны.

Пасля вайны школа была адбудаваная. Дзяцей вучылі Яніна Эдуардаўна Чаркоўская і Леакадзія Вікенцьеўна Гарбацэвіч.

У 1975 годзе школа закрыта, будынак перавезены ў Глыбокі Брод.

У 1950-я гады Дручаны становяцца цэнтрам аб'яднанага, узбуйненага калгаса імя Дзяржынскага, у склад якога ўвайшлі калгаснікі Глубокага Брода, Стадолішча, Мяжонкі, Рубяжа, Панькава. Праўленне яго ўзначаліў Іван Малашка.

У 1960 годзе дручанцаў напаткала не толькі новае аб'яднанне, але і новы статус – яны сталі рабочымі саўгаса "Падзевічы".

У 1950 годзе колькасць жыхароў Дручан значна павялічваецца, З'яўляецца новы пасёлак для перасяленцаў з вёсак Белы Лог, Асоўцы, Хатоўшчына, Жорнаўка. Прычына перасялення – пашырэнне тэрыторыі вайсковага палігону.

На жаль, зараз старажытная вёска
пастулова вымірае...

***В. Вільнеўская***

# Хто такі Леў Сапега, якія адносіны ён мае да Бялынічаў?

Леў Іванавіч Сапега нарадзіўся на Віцебшчыне, у шляхецкім маёнтку Астроўна. Атрымаў грунтоўную адукацыю ў Нясвіжскай пратэстанскай школе, Ляйпцыгскім універсітэце. Свабодна валодаў пяццю еўрапейскімі мовамі. У 1579 – 1582 гг. На чале харугвы ваяваў супраць маскоўцаў. Праз два гады ўзначаліў пасольства ў Маскве і дамогся падпісання надзвычай выгаднага для Беларусі "вечнага міру". У якасці ўзнагароды быў прызначаны на пасаду падканцлера і кіраваў замежнай палітыкай гаспадарства. Вялікая заслуга Льва Сапегі – падрыхтоўка і зацвярджэнне Статута 1588 года, артыкулы якога гарантавалі эканамічную, палітычную і культурную незалежнасць Вялікага княства Літоўскага ад Польшчы і Масковіі. Прыхільнік дэмакратычнай прававой дзяржавы – "павінны панаваць законы, а не асобы".

Дзякуючы патрыятызму і таленту Л. Сапегі, ВКЛ не толькі змагло захаваць сваю незалежнасць у найстаражытны гістарычны перыяд, але перажыло эканамічны і культурны росквіт.

Бялынічы, як і шэраг іншых паселішчаў Беларусі, з'яўлялліся родавым маёнткам Сапегаў. Леў Сапега ў 1624 годзе заснаваў у мястэчку кляштар і касцёл ордэна кармелітаў, якія садзейнічалі яго культурнаму і гандлёваму росквіту. Пры непасрэднай падтрымцы Сапегі ў бялніцкім карміліцкім кляштары ў другой палавіне 18 стагоддзя была адкрыта друкарня.

www.pbnf.org - сайт партыі БНФ

# Гісторыя раёна. Снежань

- 1-е тысячагоддзе нашай эры (другая палова). Засяленне сучаснай тэрыторыі раёна дрыгавічамі.
- 1432 – 1440. Вялікі князь Вялікага Княства Літоўскага Жыгімонт Кейстутавіч дорыць Галоўчын Самойлу.
- 1591 год. Маёнткам Бялынічы распараджаецца апякун маладой уладальніцы яго Барбары Збаражскай, Леў Сапега. Крыху пазней ён выкупляе ў яе гэты маёнтак.
- 1652 (снежань). У друкарані бялыніцкага кляштару выходзіць першая з вядомых на сёння кніг “Памінальнае слова пра Т. Сапегу, жонку падканцлера Вялікага Княства Літоўскага, аршанскага старосты, якое сказаў камісар канвентаў беларускіх кармелітаў у Бялынічах 22 лістапада 1652 года”.
- 1654 (снежань). Контранаступленне войска Рэчы Паспалітай. Чарговае спаленне Галоўчына.
- 1654, 13 снежня. Палкоўнік К. Паклонскі ў лісце да цара прасіў раздаць сваім казакам вёскі ў Галоўчынскім, Бялыніцкім, Цяцерынскім паветах – “аж по самый Борисов…”
- 1760. Кармеліты завяршаюць будаўніцтва мураванага касцёла ў форме крыжа.
- 1868, 24 снежня. Пачатак развіцця медыцынскага абслугоўвання сельскага жыхарства магілёўшчыны. На кожны павет прызначаецца урач, 7 – 9 фельдшараў, 3 павітухі.
- 1872, 7 снежня. Обер – пракурор святога Сінода паведамляе Магілёўскаму арцыбіскупу, што па справе Бялыніцкага касцёла ён гутарыў з міністрам ўнутраных спраў Валуевым аб аказанні дапамогі ў інтарэсах праваслаўя і што генерал – ад’ютант Цімашоў, маючы на ўвазе асаблівыя мясцовыя акалічнасці і запэўніванні праваслаўнага духавенства аб тым, што абраз Бялыніцкай Маці Божай належыў ім, папярэджваючы неабходнасць прадухілення пэўных абгрунтаваных пярэчанняў супраць такога запэўнівання, выказвае занепакоенасць перахростам касцёла і просіць праваслаўных яшчэ раз пашукаць у сваіх архівах доказы прыналежнасці цудатворнага абразу Бялыніцкай Маці Боскай менавіта вернікам праваслаўнай канфесіі.
- 1875. Сялянская грамада вёскі Рудня будуе сукнавальню.

# Да якой дзяржавы адносіліся бялынічане ў старажытнасці?

Элементы дзяржаўнай арганізаванасці на Беларусі існавалі задоўга да яе пісьмовай гісторыі. Ёсць шэраг сведчанняў, што нашы продкі ўжо ў 6 -7 стагоддзях н. э. мелі пэўныя формы дзяржаўнасці. З 7 стагоддзя пачынаюць фармавацца крывіцкія, дрыгавіцкія, радзіміцкія плямённыя дзяржавы. Крывічы і дрыгавічы, аб’яднаўшыся ў 10 стагоддзі, стварылі магутную дзяржаву – Полацкае княства. У гэты ж час вядомасць набываюць Смаленскае і Тураўскае княствы, якія ў хуткім часе патрапляюць у залежнасць ад Кіева. Полацкае княства, у склад якога ўваходзіла і тэрыторыя сённяшняга Бялыніцкага раёна, было самастойнай дзяржавай, з усёй адпаведнай атрыбутыкай – суверэннай уладай князя і веча, адміністрацыяй, сталіцай, войскам, прававой сістэмай.

У пазнейшыя часы лёс нашых далёкіх продкаў быў звязаны з Друцкім княствам. Яно вядома як самастойнае з першай палавіны 12 стагоддзя. На чале княства стаялі пераважна нашчадкі полацкага князя Усяслава Брачыслававіча (Чарадзея). Улада іх таксама абмяжоўвалася вечам і баярскай радай. У 2-й палове 12 ст. друцкія князі ваявалі з мінскімі за полацкі трон. У 1180 г. былі ўцягнуты ў барацьбу смаленскіх князёў з чарнігаўскімі. Князь Ігар Святаслававіч (герой “Слова аб палку Ігаравым”) імкнуўся безвынікова заваяваць Друцкае княства.

У 13 стагоддзі Друцкае княства ўвайшло ў Вялікае княства Літоўскае, але доўгі час захоўвала сваё асобнае становішча.

Бялынічы вядомыя з 16 стагоддзя, як мястэчка Аршанскага павету Вялікага Княства Літоўскага, аднак дайшоўшыя да нас легенды звязваюць узнікненне пасёлка з часамі мангола – татарскага нашэсця.

З 1772 года тэрыторыя раёна апынулася ў складзе Расіі.

***Паводле М. Карпечанкі***

Бялыніцкая
Краязнаўчы альманах (дадатак да газеты «Паходня»)
ДАЎНІНА

Кразнаўчы альманах (дадатак да газеты «Паходня»).Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна

Бялыніцкі раён, в. В.Машчаніца. тэл. 37-110. Рэдактар Вырвіч Б.І. Наклад. 299 асобнікаў